# Бібліяграфічныя дапаможнікі па мастацтве

*Ж. Л. Раманава*

Бібліяграфаваннем дакументаў па мастацтве ў 2001–2005 гадах займаліся бібліятэкі, навуковыя, вучэбныя ўстановы і арганізацыі, музеі, профільныя часопісы. Найбольш плённай у гэтым накірунку была праца Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Значная колькасць бібліяграфічных матэрыялаў публікавалася на старонках перыядычных выданняў ВНУ: "Вестника Брестского государственного технологического университета", "Весніка Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі"; часопісаў: "Мастацтва", "Архитектура и строительство", "Спадчына", "Праваслаўе", "Наша вера" і інш. Што тычыцца бібліятэк, то іх працу нельга лічыць задавальняючай: за пяць год былі складзены па аднаму бібліяграфічнаму прадукту Мінскай абласной бібліятэкай імя А. С. Пушкіна – "Народныя промыслы і рамёствы" (3683 (2002 г.)), Віцебскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна – "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Віцебшчыны" (4614 ( 2004 г.)) і Магілёўскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна – "Дзеячы архітэктуры і выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны" (3473 (2005 г., ч. 1)).

Аналіз сістэмы бібліяграфічнага інфармавання ў галіне мастацтва паказаў, што найбольш добра наладжана бягучае інфармаванне карыстальнікаў азначанай галіны. Бягучая бібліяграфічная інфармацыя змяшчаецца ў выданнях Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі (НКПБ) і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (НББ). НКПБ выдае спецыяльныя летапісы: "Нотны летапіс" і "Летапіс выяўленчага мастацтва" (3 (2001–2002 гг.), 4 (2003 г.), 2 (2004 г.), 5 (2005 г., ч. 1)). Акрамя таго, матэрыялы па мастацтве змяшчаюцца ў адпаведных раздзелах "Кніжнага летапісу", "Летапісу нарматыўна-тэхнічных, тэхнічных дакументаў і выданняў вузкага прызначэння" (3 (2001–2002 гг.), 2 (2003 г.), 4 (2004 г.), 5 (2005 г., ч. 1)), "Летапісу рэцэнзій" (3 (2001–2002 гг.), 2 (2003 г.), 4 (2004 г.), 5 (2005 г., ч. 1)), "Летапісу часопісных артыкулаў" (3 (2001–2002 гг.), 4 (2003 г.), 6 (2004 г.), 5 (2005 г., ч. 1)) і "Летапісу газетных артыкулаў" (3 (2001–2003 гг.), 5 (2004 г.), 5 (2005 г., ч. 1)).

Мастацтвазнаўчыя дакументы адлюстроўваюцца таксама ў штогодніках "Кнігі Беларусі" (2 (2001–2002 гг.), 3 (2003 г.), 4 (2005 г., ч. 1)), а крыніцы другаснай інфармацыі – у "Паказальніку бібліяграфічных дапаможнікаў Беларусі" (1 (2001–2002 гг.), 2 (2003 г.), 1 (2004 г.), 1 (2005 г., ч. 1)).

Аддзел інфармацыі па культуры і мастацтве Нацыянальнай бібліятэкі працягваў у 2001–2005 гг. бягучае інфармаванне праз такія крыніцы, як "Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва", "Актуальныя праблемы культуры і мастацтва", "Новая літаратура па культуры і мастацтву" (45 (2001 г.), 86 (2002 г.), 92 (2003 г.), 101 (2004 г.)), "Сістэматычны паказальнік неапублікаваных дакументаў па культуры і мастацтву" (46 (2001 г.).

Пераважную большасць крыніц рэтраспектыўнай бібліяграфічнай інфармацыі склалі прыкніжныя, прыартыкульныя, унутрыкніжныя і ўнутрычасопісныя бібліяграфічныя спісы, змешчаныя ў навуковых, вучэбных, даведачных выданнях па мастацтве і ў часопісах. Самымі буйнымі і цікавымі сярод іх можна прызнаць наступныя: бібліяграфічны спіс "Літаратура, рэкамендаваная для паглыбленага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вывучэння гісторыі музычнай культуры Беларусі да XX ст." (3707 (2002 г.)), змешчаны ў вучэбным дапаможніку В. У. Дадзёмавай "Нарысы гісторыі музычнай культуры Беларусі". Гэты сістэматычны спіс змяшчае 120 назваў энцыклапедый, даведнікаў, манаграфій, вучэбных дапаможнікаў, матэрыялаў канферэнцый, нот, артыкулаў на беларускай, рускай, украінскай і польскай мовах. Таксама, у выданні таго ж аўтара "Музычная культура Беларусі XVIII стагоддзя: Гісторыка-тэарэтычныя даследаванні" (4041 (2003 г.)) змешчаны чатыры бібліяграфічныя спісы выданняў на беларускай, рускай і замежных мовах: 1) алфавітны спіс 410 назваў кніг і аўтарэфератаў дысертацый; 2) алфавітны спіс "Газеты XVIII–XIX стст." – 144 назвы; 3) алфавітны спіс "Нотныя выданні" – 15 назваў; 4) "Архіўныя дакументы" – 132 назвы. Уяўляе цікавасць для спецыялістаў таксама сістэматычны бібліяграфічны спіс "Дирижирование" (4042 (2003 г.)), у якім прадстаўлены хрэстаматыі, слоўнікі, нотныя зборнікі, вучэбныя дапаможнікі, кнігі, артыкулы, праграмы.

Добрае бібліяграфічнае аснашчэнне маюць энцыклапедычныя даведнікі А. М. Кулагіна "Каталіцкія храмы на Беларусі" (3343 (2001 г.)), "Праваслаўныя храмы на Беларусі"(3344 (2001 г.)), "Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX стагоддзя" (3345 (2001 г.)).

Варта адзначыць вялікую колькасць бібліяграфічных матэрыялаў, прадстаўленых на старонках вучэбных і навуковых выданняў па музыцы: Писняк Г. Н. "Восточнославянская народная инструментальная музыка: Классификация жанровой терминологии. На материале историко-литературных памятников письменных и устных традиций" (3733 (2002 г.)); "Аркестравы клас: Праграма для ССНУ па спецыяльнасці 18.01.01 "Народная творчасць", "Інструментальная музыка (нар.)" (4044 (2003 г.)); Мишуров Г. С. "Белорусское народно-инструментальное искусство: традиции и современность" (4075 (2003 г.)); Пенчук Б. М. "Дирижеру духового оркестра" (4077 (2003 г.)); Антоневич В. А. "Белорусская музыка XX века: Композиторское творчество и фольклор" (4654 (2004 г.)); Мдивани Т. Г. "Западный рационализм в музыкальном мышлении XX-века" (4660 (2004 г.)); Писняк Г. Н. "Инструментальная музыка в восточнославянском фольклоре" (4664 (2004 г.)); Дадзёмава В. У. "Музычная культура Беларусі XVIII стагоддзя: гістарычна-тэарэтычныя даследаванні" (3502 (2005 г., ч. 1)); Писняк Г. Н. "Восточнославянская народная инструментальная музыка: конспект лекций и материалы" (3520 (2005 г., ч. 1)). Гэтыя бібліяграфічныя спісы ўключаюць ад 100 да 700 назваў дакументаў.

За перыяд 2001–2005 гг. выйшла ўсяго два асобных бібліяграфічных паказальніка і адзін бібліяграфічны спіс. Бібліяграфічны паказальнік, створаны Віцебскай абласной бібліятэкай імя У. І. Леніна "Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Віцебшчыны" (4614 (2004 г.)) мае сістэматычную групоўку матэрыялаў, унутры раздзелаў выдзяляюцца рубрыкі-персоны найбольш знакамітых майстроў прыкладнога мастацтва. У паказальнік уключаны кнігі, артыкулы, альбомы, каталогі. Усяго ў выданне ўвайшло 882 дакументы на беларускай і рускай мовах. Бібліяграфічны паказальнік "Дзеячы архітэктуры і выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны" (3473 (2005 г., ч. 1)) быў складзены ў Магілёўскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна. У бібліяграфічны спіс "Народныя промыслы і рамёст-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вы" (3683 (2002 г.)), складзены ў Мінскай абласной бібліятэцы імя А. С. Пушкіна, увайшло 106 назваў кніг, матэрыялаў канферэнцый, альбомаў, праграм, артыкулаў на беларускай і рускай мовах. Гэтыя бібліяграфічныя матэрыялы вельмі каштоўныя і значныя, але, на вялікі жаль, іх тыраж вельмі абмежаваны (напрыклад, тыраж паказальніка "Дзеячы архітэктуры і выяўленчага мастацтва Магілёўшчыны" складае ўсяго 10 экз.), што не дазваляе азнаёміцца з імі шырокаму колу карыстальнікаў.

Рэкамендацыйная бібліяграфічная інфармацыя ў галіне мастацтва прадстаўлена выданнямі НББ. У адпаведных раздзелах паказальніка "Новыя кнігі: Па старонках беларускага друку" (5 (2001–2002 гг.), 8 (2003 г.), 6 (2004 г.), 7 (2005 г., ч. 1)) адлюстроўваюцца новыя дакументы па мастацтве і публікуюцца рэкамендацыйныя спісы-дадаткі па актуальных праблемах. Напрыклад, у якасці дадатка да № 11 за 2004 г. выйшаў бібліяграфічны спіс "Беларускае мастацтва на старонках выданняў XXI стагоддзя". Рэкамендацыйны характар насіў і паказальнік "Беларуская мова, літаратура і мастацтва" (3559 (2001 г.), 3909 (2002 г.), 4872 (2004 г.)), у якім адлюстроўваліся лепшыя дакументы па мастацтве. Ён меў шмат дапаможных паказальнікаў, матэрыялы ў ім анатаваліся. На жаль, з 2005 года паказальнік перастаў выдавацца.

Найбольш бібліяграфічна забяспечаным у 2001–2005 гг. з'явіўся такі від мастацтва, як музыка. На другім месцы – архітэктура, на трэцім – жывапіс і графіка.

Аналіз другаснага патоку па мастацтве паказаў, што ў развіцці сістэмы бібліяграфічных дапаможнікаў дадзенай галіны назіраецца пэўны дысбаланс. Істотна, у колькасных і якасных адносінах, пераважаюць у патоку крыніцы бягучай бібліяграфічнай інфармацыі. Навукова-дапаможная рэтраспектыўная бібліяграфія прадстаўлена, у асноўным, невялікімі па аб'ёму (5–20 пазіцый) несамастойнымі формамі. Выдадзеныя самастойныя бібліяграфічныя дапаможнікі прадстаўлены адзінкавымі прыкладамі і маюць зусім малы тыраж. Не лепшым чынам абстаяць справы і з рэкамендацыйным інфармаваннем. Такім чынам, бібліяграфічнае аснашчэнне галіны з'яўляецца недастатковым і не можа паўнацэнна забяспечваць інфармацыйныя патрабаванні карыстальнікаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ